Источник: "Навука" - 2017-11-20




# SOLA FIDE

**500 гадоў споўнілася з часу, калі Марцін Лютэр склаў 95 тэзісаў супраць індульгенцый і, як сведчыць паданне, прыбіў іх да брамы сабора ў Вітэнбергу, паклаўшы пачатак эпосе Рэфармацыі. Адбылася гэтая падзея 31 кастрычніка 1517 года.**

Асноўнымі прынцыпамі рэфарматараў былі «sola fide» (толькі вераю), «solus Christus» (толькі Хрыстос), «sola Scriptura» (толькі Святое Пісьмо). Свае ідэі Марцін Лютэр і Філіп Меланхтон распаўсюджвалі ў выглядзе надрукаваных пропаведзяў-кніжачак.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі (ЦНБ) захоўвае ў сваіх сховішчах кніжныя помнікі, створаныя на хвалі Рэфармацыі.

Прэзентацыя выставы «Sola fide» прыпала на 10 лістапада – дзень народзінаў М.Лютэра. Адкрываючы яе, дырэктар ЦНБ А.Груша звярнуў увагу гасцей на супадзенне значных дат у еўрапейскай гісторыі: пачатак беларускага кнігадрукавання і Рэфармацыі, а таксама на значэнне Рэфармацыі ў гісторыі Беларусі. А.Груша запрасіў прысутных азнаёміцца з экспанатамі выставы, сярод якіх – прыжыццёвыя выданні М.Лютэра і Ф.Меланхтона, багаслоўская праца малавядомага пратэстанцкага пісьменніка Мікалая Сельнэчэры з Лейпцыга, творы Эразма Ратэрдамскага, Біблія Марціна Лютэра (1675) і інш. Увазе гасцей была прадстаўлена і Брэсцкая (Радзівілаўская) Біблія, выдадзеная ў 1563 годзе на сродкі Мікалая Радзівіла Чорнага. Пераклад Бібліі зроблены прыхільнікамі кальвінізму і прызначаўся для патрэб рэфармацыйнага руху ў Вялікім Княстве Літоўскім і Польшчы.

У адкрыцці выставы прыняла ўдзел намеснік пасла і кіраўнік аддзела культуры Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Мінску спадарыня Аня Лютэр. Яна падкрэсліла, што святкаванне 500-годдзя Рэфармацыі – гэта вялікая гістарычная падзея ў Германіі, а дзень 31 кастрычніка абвешчаны нацыянальным святам. «Той факт, што гэтай падзеі надаецца ўвага ў Беларусі, нават у самой Акадэміі навук, напаўняе мяне пачуццём удзячнасці», – адзначыла спадарыня А.Лютэр.

«Марцін Лютэр і Рэфармацыя ў Еўропе» – з такой тэмай перад прысутнымі выступіў аўтар кнігі «Залаты век Беларусі» Антоній Бокун. Ён правёў паралель жыццёвых шляхоў Францыска Скарыны і Марціна Лютэра, а таксама падкрэсліў уплыў Рэфармацыі на жыццё нашай краіны.

Усе ўдзельнікі свята атрымалі на памяць аб сустрэчы перакладзеныя на беларускую мову 95 тэзісаў Марціна Лютэра – падарунак Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія.

**Вольга ПАНАСІНА,
загадчык аддзела
сацыякультурнай
і інфармацыйнай дзейнасці
ЦНБ НАН Беларусі**